# КАНТРЫБУЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ (1863–1896 гг.): АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

***М. А. Крэнць***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, krents@bsu. by*

У артыкуле прааналізаваны асноўныя праблемы пры даследаванні кантрыбуцыйных мерапрыемстваў, разгледжаны актуальныя метады аналізу сацыяльных і эканамічных працэсаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX ст.

***Ключавыя словы:*** землеўладальнікі «польскага паходжання»; кантрыбуцыйныя мерапрыемствы; сацыяльная сруктура; дробная шляхта; аднадворцы; сялянства; палітыка ўніфікацыі.

# КОНТРИБУЦИОННЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ (1863–1896 гг.): АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ И МЕТОДЫ ИССЛЕДОВАНИЯ

***М. А. Крентъ***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, krents@bsu. by*

В статье проанализированы основные проблемы при исследовании контрибуционных мероприятий, рассмотрены современные методы анализа социально-экономических процессов в белорусской губернии во второй половине XIX века.

***Ключевые слова:*** землевладельцы «польского происхождения»; контрибуционные мероприятия; социальная структура; мелкая шляхта; однодворцы; крестьянство; социальная структура; политика унификации.

# CONTRIBUTION MEASURES IN IN THE BELARUSIAN PROVINCES (1863–1896): CURRENT PROBLEMS AND RELEVANT METHODS OF RESEARCH

***M. Krents***

*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, krents@bsu. by*

The article analyzes the principal problems of the research on the contribution measures. The article explores the relevant methods of analysis of socio-economic processes in the Belarusian provinces.

***Key words:*** landowners «of Polish descent»; contribution measures; social structure; petty gentry; small–holders; the peasantry; social structure; unification policy.

Вывучэнне падзей і працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. уяўляе сабой асаблівую важнасць зыходзячы з ролі дадзенага

перыяду гісторыі ў станаўленні беларускага грамадства. Сацыяльна-эканамічныя працэсы, палітычныя мерапрыемствы ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі — дадзеныя праблемы патрабуюць дэталёвага і скрупулёзнага даследавання. Адной з такіх праблем, якая патрабуе асобнага даследавання, з'яўляецца праблема правядзення і рэалізацыі кантрыбуцыйных мерапрыемстваў на тэрыторыі беларускіх губерняў у 1863–1896 гг.

Такім чынам, *мэта* дадзенага артыкула — прааналізаваць асноўныя праблемы пры даследаванні кантрыбуцыйных мерапрыемстваў, разгледзець актуальныя метады аналізу сацыяльных і эканамічных працэсаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX ст.

Тэма кантрыбуцыйных мерапрыемстваў у беларускай і замежнай гістарыяграфіі разглядалася толькі фрагментарна. У савецкі перыяд гістарыяграфіі тэма кантрыбуцыйных збораў закраналася ў працах А. І. Цвікевіча [1], С. М. Самбук [2], В. П. Панюціча [3]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі распрацоўкай дадзенай праблемы займаліся А. Г. Каханоўскі [4–8], В. С. Макарэвіч [9–10]. Фрагментарна разглядалася дадзеная тэма ў працах расійскіх гісторыкаў А. А. Камзолавай [11] і М. Д. Далбілава [12]. Таксама праблеме кантрыбуцыйных збораў нададзена ўвага ў манаграфіі літоўскага гісторыка Д. Сталюнаса [13].

Кантрыбуцыйныя мерапрыемствы — асаблівыя мерапрыемствы, якія праводзіліся расійскай адміністрацыяй на тэрыторыі заходніх губерняў, па спагнанні грашовых сродкаў у памеры 1–10 % ад інвентарнага кошту зямельнай або нерухомай маёмасці з землеўладальнікаў і гарадскіх жыхароў каталіцкага веравызнання. Кантрыбуцыі адрозніваліся формай і парадкам справаздачнасці. Кантрыбуцыйныя мерапрыемствы праводзіліся таксама ў гарадах і спаганяліся з усіх жыхароў каталіцкага веравызнання і польскага паходжання без уліку саслоўнага паходжання [14, арк. 3]. Кантрыбуцыі спаганяліся з землеўладальнікаў дваранскага саслоўя ці аднадворцаў каталіцкага веравызнання (у рэдкіх выпадках, кантрыбуцыйныя зборы спаганяліся з сялян) [15, арк. 1]. Кантрыбуцыйныя зборы маглі быць узмоцненымі (спаганяліся ў двайным памеры), прадугледжваліся льготы для непаўнагадовых, інвалідаў, уладанняў з неўрадлівай глебай. Акрамя таго, незапланававыя кантрыбуцыі маглі спаганяцца на вясковыя варты [16, арк. 11], таксама ў выпадку неўраджаю «для забяспячэння народнага харчавання» [17, арк. 1]. У 1867–1869 гг. адбываецца рэфармаванне сістэмы кантрыбуцыйных збораў, кантрыбуцыі ўключаюцца ў рэестр падаткаў з нерухомай маёмасці [18, с. 187].

Прававая неаднастайнасць і супярэчлівасць кантрыбуцыйных законаў спараджае некаторыя праблемы пры вывучэнні дадзеных мерапрыемстваў. Варта заўважыць, што кантрыбуцыйныя зборы прымаліся ў спешцы і па асабістай ініцыятыве віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва. Данная мера была зацверджана Заходнім камітэтам — спецыфічным органам улады ў заходніх губернях, які дзейнічаў у перыяд найбольшай напружанасці на гэтых тэрыторыях (1862–1865 гг.). Шмат у чым, рашэнне Заходняга камітэта зацвердзіць ініцыятыву віленскага генерал-губернатара было спалучана з жаданнем забяспечыць фінансамі ўніфікацыйныя мерапрыемствы ў заходніх губернях, напрыклад, на выплату надбавак для чыноўнікаў рускага паходжання [19, с. 116]. Таксама з дадзеных сродкаў павінны былі фінансавацца пабудова школ, цэркваў, аб’ектаў гарадской інфаструктуры і г. д. [20, арк. 18].

Да 1869 г. кантрыбуцыйныя мерапрыемствы праводзіліся з вялікімі складанасцямі. Не было ўяўлення аб адзіным стандарце ацэнкі зямлі і нерухомай маёмасці, як і паняцці аб тым, хто менавіта падпадае пад крытэрый «асоба польскага паходжання» [21, с. 55]. Як правіла, пад дадзены крытэрый падпадала менавіта насельніцтва каталіцкага веравызнання, за выключэннем, напрыклад, перасяленцаў з Германскай ці Аўстра-Венгерскай імперый непольскай нацыянальнасці [22, арк. 6]. З крытэрыямі ацэнкі зямлі ўладам удалося вырашыць праблему толькі ў ходзе рэфармавання 1869 г., калі замест служачых мясцовай адміністрацыі, ацэнкай зямлі занялася спецыяльная камісія, якая складалася з прадстаўнікоў мясцовых землеўладальнікаў і кампетэнтных спецыялістаў.

Праблемай з'яўлялася і вызначэнне канкрэтнага тэрміна, які абазначаў кантрыбуцыйны збор у афіцыйным справаводстве. Спачатку найболей часта ўжываўся тэрмін «временной», далей у справаводстве мясцовай адміністрацыі замацаваўся тэрмін «процентный сбор», у заканадаўстве ўжываліся ў тым ліку і спалучэнні тэрмінаў: «особый сбор, установленный в связи с восстанием 1863 г. «, «особый временный» или «особый процентный» [21, с. 52]. Наогул, блытаніна з вызначэннем тэрміна па кантрыбуцыйных зборах прысутнічала ў справаводстве да самай адмены збора ў 1897 г. У той жа час, у лакальным ужытку за зборам замацавалася вызначэнне «кантрыбуцыйнага». У бухгалтарскім справаводстве мясцовых землеўладальнкаў, у прашэннях да губернатара і нават у дакументах губернскіх канцылярый фігуруе тэрмін «кантрыбуцыі» і «кантрыбуцыйны збор» [21, с. 51–52].

Калі звярнуцца да праблемы вызначэння кошту зямельнай маёмасці, трэба адзначыць важны аспект, што вызначаўся менавіта інвентарны кошт зямлі, а не рынкавы. Усталяваны інвентарны кошт зямлі, аднак, значна адрозніваўся ад рынкавых коштаў — амаль у дзесяць раз. Калі ў сярэднім, рынкавы кошт дзясяціны зямлі ў заходніх губернях па падліках Стывена Хока складаў 36 руб. 74 кап., то сярэдні інвентарны кошт па паветах прыкладна 3 руб. [23, с. 96]. Хоць, аднак, маёнткі землеўладальнікаў каталіцкага веравызнання часта прадаваліся па кошту прыблізна 30 руб. за дзесяціну. Такім чынам, меркаванне аб катастрафічнай суме кантрыбуцыйнага збору некалькі перабольшана [21, с. 55].

Пры даследаванні кантрыбуцыйных мерапрыемстваў важна разумець складанасці ў працы мясцовай адміністрацыі. Напрыклад, кантрыбуцыйныя зборы не датычыліся сялян (у незалежнасці ад іх канфесійнай прыналежнасці). Выключэнне складалі сяляне тых вёсак, якія бралі ўдзел у паўстанні альбо ж сяляне каталіцкага веравызнання, якія валодалі маёмасцю ў горадзе. Аднак, з сялян маглі спаганяцца кантрыбуцыі ў тым ліку з-за памылкі мясцовых улад, якія своечасова не выключылі маёнтак селяніна з раскладкі па зборах. У такіх выпадках збор адмяняўся пасля звароту селяніна да павятовай камісіі ці да губернатара. Часам мясцовая адміністрацыя магла адмовіць сялянам каталіцкага веравызнання ў адмене збору, што было неправамерна. Але здараліся сітуацыі, у якіх збор не адмяняўся нават землеўладальнікам сялянскага ці мяшчанскага саслоўя праваслаўнага веравызнання. Напрыклад, 7 чэрвеня 1891 г. да Себежскай павятовай камісіі звярнуўся Рыгор Юзэфовіч, які ў 1889 г. набыў маёнтак, пасля чаго у 1890 г. маёнтак быў абкладзены кантрыбуцыйным зборам у памеры 2 р. 83 кап. Юзэфовіч прадставіў камісіі пасведчанне аб тым, што 31 мая 1864 г. ён быў звернуты ў праваслаўе і па цяперашні час вызнае праваслаўе [24, арк. 1]. У тэксце пасведчання фігуруе менавіта тэрмін «далучаны». Рашэннем камісіі стала адмова Юзэфовічу, «бо каталікі, якія прынялі праваслаўе, не маюць права набываць зямельную ўласнасць у Заходнім краі і за адсутнасцю закона, які дае такім асобам ільготу і па плацяжу % збору, за прыналежную ім зямлю» [24, арк. 3]. Падобныя сітуацыі з'яўляюцца выключэннем, але дзейсна ілюструюць агульную сітуацыю неаднароднасцю прававых норм і недакладнасцю заканадаўчай базы.

Таксама варта заўважыць, што акрамя прававых аспектаў праблемным пытаннем пры даследаванні кантрыбуцыйных мерапрыемстваў становіцца эканамічны эфект дадзеных мерапрыемстваў

на стан гаспадаркі мясцовых землеўладальнікаў, працэсы мадэрнізацыі на тэрыторыі беларускіх губерняў. Акрамя таго, вызначыць, наколькі дадзеная сітуацыя спрыяла павышэнню эканамічнай актыўнасці сялянства, зменам у сацыяльнай структуры грамадства. Падобныя пытанні патрабуюць выкарыстання больш шырокага спектру метадаў гістарычнага аналізу.

Для вырашэння актуальных задач даследаванняў сацыяльных і эканамічных працэсаў патрабуецца пашырэнне метадалагічнага інструментарыя метадамі статыстычнага аналізу, напрыклад, выкарыстаннем рэгрэсіўных ўраўнанняў, шматмернага статыстычнага аналізу і інш. Як адзначае А. Г. Каханоўскі: «з дапамогай традыцыйных метадаў гістарычнага аналізу за мноствам лічбаў складана акрэсліць узаемазалежнасць паказчыкаў, якія адлюстроўваюць узаемасувязі элементаў сацыяльнай структуры. Для вырашэння гэтай задачы адным з метадаў выкарыстаны рэгрэсіўны аналіз, які дазваляе прааналізаваць сувязь кожнай з характарыстык, абраных у якасці выніковых (залежных), адначасова з шэрагам іншых (фактарныя паказчыкі) і гэтыя сувязі ранжыраваць па ступені праяўлення. Будуецца рэгрэсіўнае ўраўненне, кожны каэфіцыент якога дазваляе вызначыць ступень змянення на паветах значэнняў выніковай характарыстыкі пры змяненні на адзінку фактарнай, а таксама ацаніць сукупную ступень спалучанасці варыяцый значэнняў улічаных фактарных паказчыкаў і выніковага» [25, с. 48]. Працы А. Г. Каханоўскага сталі наватарскімі для беларускай гістарычнай навукі, у якіх выкарыстоўваліся актуальныя метады для вырашэння праблем аналізу саслоўна–карпаратыўнай арганізацыі насельніцтва беларускіх губерняў, сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства. Так, напрыклад, для апрацоўкі масіўных аб'ёмаў дэмаграфічнай статыстыкі А. Г. Каханоўскім выкарыстоўваліся метады шматмернага статыстычнага аналізу [26, с. 195], для вызначэння рэгіянальных асаблівасцей у разгортванні сацыяльных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, эвалюцыі сацыяльнай структуры беларускага грамадства выкарыстоўваўся агламератыўна–іерархічны метад кластэрнага аналізу [25, с. 49]. Трэба заўважыць, што шматлікія тэарытычныя аспекты выкарыстання актуальных метадаў статыстычнага аналізу сацыяльнай дынамікі былі разгледжаны ў манаграфіі Л. І. Бародкіна [27, с. 49–71].

Даследаванне праблем сацыяльнай і эканамічнай гісторыі Беларусі XIX ст. з'яўляецца надзвычай актуальным у сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Дадзены перыяд характарызуецца мноствам працэсаў,

фактараў і аспектаў сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі Беларусі, станаўленнем беларускага грамадства. Кожная даследчыцкая праблема патрабуе адмысловага падыходу і метадалагічнага інструментарыя для вырашэння пастаўленных перад даследаваннем задач. Даследаванне кантрыбуцыйных мерапрыемстваў адкрывае абсалютна новыя аспекты працэсаў палітычнага, эканамічнага развіцця беларускіх губерняў, дазваляе зірнуць на дадзеныя працэсы з іншага ракурсу і паставіць перад даследаваннямі гісторыі Беларусі XIX ст. актуальныя пытанні.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Цьвікевіч А. «Западно–руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2–е выд. Менск: Навука і тэхніка, 1993. 352 с.

2. Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. Минск: Наука и техника, 1980. 224 с.

3. Панютич В. П. Социально–экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Минск : Акад. наук БССР, Ин–т истории : Навука і тэхніка, 1990. 374 с.

4. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск: Беларус. дзярж. ун–т., 2013. 335 с.

5. Каханоўскі А. Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7 / редкол.: А. П. Сальков, О. А Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск : БГУ, 2012. с. 80–91.

6. Кохановский А. Г. На пути становления индустриального общества: модернизационные процессы в Беларуси (60–е гг. XIX – начало XX в.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 3 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2008. С. 31–46.

7. Каханоўскі А. Г. Разгортванне мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX–XX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 4 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2009. С. 218–228.

8. Каханоўскі А. Г. Уніфікацыя і русіфікацыя як накірункі ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 6 / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск БГУ, 2011. С. 20 – 26

9. Макарэвіч В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.). Мінск: Беларус. дзярж. ун–т., 2018. 315 с.

10. Макарэвіч В. С. «Панскі разбор шляхты»: абеззямельванне чыншавікоў у 2-ой палове ст. і чыншавая рэформа ў 1886 г. у Беларусі // Беларус. гіст. часоп. 2011. № 4.

11. Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо–Западном крае в эпоху Великих реформ М.: Наука, 2005. 383 с.

12. Долбилов М. Д. Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II М.: Новое обозрение, 2010. 999 с.

13. Staliūnas, D. Making Russians. Meaning and Practice of Russification in Lithuania and Belarus after 1863 . Amsterdam/New York: Rodopi, 2007. 480 p.

14. Дело о раскладке 1 % сбора с домовладельцев польского происхождения губернского и уездных городов в 1864 г. // НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1672.

15. Переписка об обложении шляхетских околиц и однодворческих обществ временным обором, согласно предписанию Главного начальника // НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1517.

16. Дело о раскладке 5 % сбора на помещиков польского происхождения в Минской губернии // НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1673.

17. Окладные листы по денежным сборам на обеспечение народного продовольствия с бывшей Польской шляхты по Минской губернии на 1885 г. // НГАБ. Ф. 333 Воп. 2. Спр. 725.

18. Правила раскладки и взимания процентного сбора в Западных губерниях №46807 // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 2–е: в 55 т. СПб., 1869. Т. 44. Отд. 1.

19. Лепеш О. В. Комитет западных губерний (1831–1848 гг.) и Западный комитет (1862–1865 гг.) – высшие территориальные комитеты по управлению территорий Беларуси в XIX в. // Юбилейный сборник научных трудов работников кафедры «История, мировая и отечественная культура» Белорусского национального технического университета : к 60–летию кафедры «История, мировая и отечественная культура» / под ред. В. А. Божанова, С. В. Боголейши. Минск: БНТУ, 2016. С. 109–116.

20. О составлении сметы расходов, предстоящим в 1866 г. из суммы 1 % сбора // НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 32466.

21. Крэнць М. А. Нарматыўна–прававое рэгуляванне кантрыбуцыйных і абмежавальных мерапрыемстваў урада Расійскай імперыі (1863–1896 гг.) // Гістарычна–археалагічны зборнік / Гал. рэд.: А. А. Каваленя. Вып. 35. Мінск: Беларус. навука, 2020. С. 51–57.

22. Дело по прошению помещика барона Антона фон Фелькерана, губернского секретаря Иосифа Конюшевского о сложении % сбора // НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 35345.

23. Миронов Б. Н. Российская империя: от традиции к модерну. 2-й том. СПб.: «Дмитрий Буланин», 2015. 912 с.

24. Дело по отношению Себежской уездной комиссии по составлению раскладки % сбора, о сложении процентного сбора с имения «Борисовичи» Себежского уезда принадлежащего ныне Григорию Юзефовичу // НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 41052.

25. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: Метадалогія і методыка аналізу. // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 4 / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск: БГУ, 2009. С. 44–50

26. Каханоўскі А. Г. Статыстычныя крыніцы па гісторыі Беларусі 60–90 гг. XIX ст. // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 2 / Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. Мн.: БДУ, 2005. С. 193–200.

27. Бородкин Л. И. Моделирование исторических процессов: от реконструкции реальности к анализу альтернатив . СПб.: Алетейя, 2016. 304 с.